# ПРАМОВА ДЭПУТАТА А. А. ВОЛКАВА

Таварышы дэпутаты Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей, я выступаю ад імя дэпутатаў Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.

Я поўнасцю падтрымліваю прапанову дакладчыка — дэпутата тав. Горкіна аб змене 29 артыкула Канстытуцыі СССР. Гэты артыкул гаворыць, што побач з другімі саюзнымі рэспублікамі Беларуская ССР не мае ў сваім складзе аўтаномных рэспублік, роўна як краёў і абласцей.

У 29 артыкул Канстытуцыі неабходна ўнесці змену аб утварэнні ў Беларускай ССР пяці абласцей.

Дэпутат Горкін тут ужо гаварыў, што ў Беларусі налічваецца звыш пяці мільёнаў насельніцтва.

Совецкая Беларусь мае велізарны рост культуры і дабрабыту шырокіх мас, вялікі рост эканомікі рэспублікі.

Усё гэта выклікае неабходнасць наблізіць органы кіравання да шырокіх мас з тым, каб наш апарат задавальняў усе запатрабаванні працоўных на аснове вялікай Сталінскай Канстытуцыі. (Апладысменты).

Працоўныя Беларусі ішлі ў адзінай шарэнзе з усімі народамі Совецкага Саюза і дабіліся вялізных поспехаў. Я хачу назваць некалькі лічбаў, якія паказваюць вялікія дасягненні Совецкай Беларусі.

Валавая прадукцыя прамысловасці Беларусі за другую сталінскую пяцігодку павялічылася ў $2^{1}/_{4}$ раза. У 1937 г. прамысловасць Беларусі дала прадукцыі на суму 2.100 мільёнаў руб. Для параўнання ўкажу, што ў 1913 годзе прамысловасць дала прадукцыі ўсяго на 89 мільёнаў рублёў.

Совецкая Беларусь па свайму плану намячае ў трэцяй пяцігодцы давесці валавую прадукцыю прамысловасці да 5 з лішкам мільярдаў рублёў. У адпаведнасці з ростам прамысловасці, хутка расце гарадское насельніцтва.

У Беларусі налічваецца 10 тысяч калгасаў, якія ахапляюць 680 тысяч гаспадарак. 140 МТС, 6.500 трактараў абслугоўваюць калгасы нашай рэспублікі.



У 1938 годзе, па рашэнню ЦК ВКП(б) і Соўнаркома Саюза ССР у нашай рэспубліцы занава арганізуюцца 74 МТС, якія атрымаюць 1.400 новых трактараў. (Апладысменты).

Гэта, несумненна, прывядзе да яшчэ большага росквіту эканомікі і культуры Совецкай Беларусі. Гэта дае нам магчымасць яшчэ лепш весці барацьбу за ўраджай у 7—8 мільярдаў пудоў хлеба, як гэта ўказаў таварыш Сталін (шумныя апладысменты), поўнасцю выканаць вялікі лозунг таварыша Сталіна аб заможным жыцці нашага калгасніка. (Апладысменты). Гэта дае магчымасць яшчэ лепш ўмацаваць нашы граніцы.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ